партызанскіх атрадаў Віцебскай вобласці актывізавалі агітацыйна-прапагандысцкую работу. Толькі ў 1-й Беларускай брыгадзе камсамольцы-агітатары правялі гутаркі «Моцныя людзі», «Партызаны дапамагаюць фронту», «Партызанская барацьба», «Смелы заўсёды перамагае», «Руская душа», «Абарона Сталінграда», «Партызаны-разведчыкі» і іншыя [4].

У снежні 1943 года па рашэнню Вілейскага абкома камсамола ў трох зонах вобласці (паўночнай, цэнтральнай, паўднёва-усходняй) былі праведзены нарады сакратароў РК ЛКСМБ па прапагандзе, на якіх былі выяўлены недахопы ў правядзенні агітацыйнай работы ў партызанскіх атрадах [5]. Пасля гэтых нарад падпольныя райкомы камсамола, камсамольскія арганізацыі партызанскіх атрадаў значна павялічылі колькасць і якасць лекцый, гутарак, дакладаў. За люты 1944 года камсамольскія агітатары вобласці прачыталі і правялі звыш 270 дакладаў і гутарак для партызанскай моладзі, на якіх прысутнічала каля 7 тыс. чалавек [6].

Умела арганізаваная ідэйна-палітычная работа ў атрадах і брыгадах аказвала значны ўплыў на актывізацыю іх баявой дзейнасці, служыла справе згуртавання падраздзяленняў, умацавання ў іх воінскай дысцыпліны, павышэння ідэйнай загартоўкі партызанскай моладзі. 24 лютага 1944 года сакратар Брэсцкага АК ЛКСМБ Ф. Д. Ромма пісаў, што палітыка-масавая работа, якую праводзілі камсамольцы, дала канкрэтныя вынікі: узмацніліся баявыя справы камсамольцаў і моладзі, узрасла іх дысцыпліна, значна выраслі камсамольскія арганізацыі за кошт лепшых маладых партызан. Толькі за 1943 год маладымі партызанамі Брэстчыны, па няпоўных звестках, было знішчана больш за 1400 гітлераўцаў, пушчана пад адхон 412 варожых эшалонаў, разбіта 346 паравозаў і 2980 вагонаў, узарвана 96 аўтамашын, 92 шашэйныя і чыгуначныя масты, знішчана 356 кіламетраў тэлефонна-тэлеграфнай сувязі. Камсамольцы ўдзельнічалі ў разгроме 82 гарнізонаў праціўніка [7].

Такім чынам, масавая па характару, мабільная па формах і метадах, глыбока ідэйная па зместу, вусная палітычная прапаганда і агітацыя камсамола, дзякуючы ўдаламу партыйнаму кіраўніцтву, духоўна ўзбройвала моладзь у барацьбе з моцным і каварным ворагам, усяляла ў сэрцы змагароў перакананне ў перамогу, была жыватворнай крыніцай фарміравання высокіх баявых і маральных якасцей партызан.

1 Ленинский комсомол в Великой Отечественной войне. М., 1975. С. 376.
2 ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 3856, воп. 1, спр. 15, л. 132; Ф. 63, воп. 16, спр. 8, л. 40.
3 ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 63, воп. 16, спр. 12, л. 163.
4 Там жа. Ф. 3500, воп. 4, спр. 16, л. 302.
5 Там жа. Ф. 63, воп. 16, спр. 9, л. 149.
6 Там жа. Воп. 5, спр. 77, л. 49.
7 Там жа. Воп. 16, спр. 15, л. 70, 71.

І. Д. СТАДУБ

## РОСТ І ПАЛЯПШЭННЕ САСТАВУ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ (ліпень 1944—1961)

Вызваленне тэрыторыі рэспублікі ад фашысцкіх захопнікаў, а затым пераможнае заканчэнне Вялікай Айчыннай вайны паставілі перад беларускім народам і КПБ як яго авангардам складаныя і адказнейшыя задачы па паскоранаму аднаўленню разбуранай гаспадаркі, жылля. Трэба было неадкладна накіраваць творчую энергію і ініцыятыву мас на вырашэнне гаспадарчых і палітычных задач, колькасна і якасна ўмацаваць партыйныя арганізацыі, павысіць іх уплыў на важнейшых участках прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, у дзяржаўных і грамадскіх арганізацыях, узняць авангардную ролю камуністаў.

У. І. Ленін неаднаразова падкрэсліваў, што сіла партыі ў першую чаргу вызначаецца якасным саставам яе членаў, іх ідэйнасцю, арганізаванасцю і дысцыплінай. Ён пісаў, што наша партыя — «адзіная ўрадавая партыя ў свеце, якая клапоціцца не аб павелічэнні колькасці членаў, а аб павышэнні іх якасці...»[1] На думку У. І. Леніна, ад якаснага саставу партыйных радоў у значнай ступені залежыць характар і змест дзейнасці партыі, усіх яе арганізацый.

Зыходзячы з гэтага, партыйныя органы Беларусі накіроўвалі свае намаганні на паляпшэнне якасці і аднаўленне колькасці партыйных радоў. Пры гэтым яны ўлічвалі змяненні, якія адбыліся ў партыйных арганізацыях за гады вайны. Больш 28 тыс. камуністаў, ці 38 % саставу КП(б)Б, былі мабілізаваны ў армію і змагаліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны, 10848 чалавек былі накіраваны на акупіраваную тэрыторыю рэспублікі для правядзення палітычнай работы сярод насельніцтва, арганізацыі і кіраўніцтва партызанскім рухам і падполлем. Звыш 26 тыс. працавалі на прадпрыемствах, у калгасах, саўгасах, у партыйных і савецкіх органах у тыле, больш 14 тыс. загінулі на франтах вайны. На 1 жніўня 1944 года на партыйным уліку ў КП(б)Б было толькі 10 606 камуністаў, у той час як напярэдадні вайны — 75 051 [2].

У першыя гады пасля вызвалення аднаўленне партыйных радоў ажыццяўлялася галоўным чынам за кошт дэмабілізаваных воінаў, вяртання камуністаў з партызанскіх атрадаў і тыла, аднак мала ўвагі надавалася арганізацыі новага прыёму і паляпшэнню саставу. Новае папаўненне складалася ў асноўным з служачых і нявялікай колькасці рабочых, перадавікоў сельскай гаспадаркі, інжынерна-тэхнічных работнікаў і іншых спецыялістаў народнай гаспадаркі. Так, у саставе прынятых кандыдатамі ў члены партыі з другога квартала 1944 па 1 жніўня 1946 года рабочых прадпрыемстваў прамысловасці і транспарту налічвалася 10,6, інжынерна-тэхнічных работнікаў — 4 %[3].

Сканцэнтраваўшы асноўныя намаганні на вырашэнні гаспадарчых пытанняў, многія партыйныя камітэты не надавалі належнай увагі рабоце з кандыдатамі, іх ідэйна-палітычнаму выхаванню, у выніку чаго значная колькасць кандыдатаў мела пратэрмінаваны стаж. Па стану на 1 студзеня 1946 года ў КП(б)Б іх налічвалася 72,9 %, пры гэтым многія сталі кандыдатамі ў перадваенны перыяд і першыя гады вайны [4].

Такое становішча было характэрным не толькі для КП(б)Б, але і для іншых партыйных арганізацый краіны. У сувязі з гэтым ЦК ВКП(б) прыняў рад пастаноў, сярод якіх трэба выдзеліць «Аб росце партыі і аб мерах па ўзмацненню партыйна-арганізацыйнай і партыйна-палітычнай работы з уступіўшымі ў ВКП(б)» (26 ліпеня 1946 года) і «Аб рабоце ЦК КП(б) Беларусі» (25 студзеня 1947 года)[5]. У іх былі падведзены вынікі росту радоў партыі ў гады вайны, усебакова прааналізаваны недахопы, вызначаны асноўныя напрамкі паляпшэння прыёму, якаснага саставу прымаемых, узмацнення арганізатарскай і выхаваўчай работы з маладымі камуністамі, далейшага ўдасканалення ўсёй унутрыпартыйнай работы. У прыватнасці, адзначалася, што «ў кіраўніцтве справай прыёму ў партыю многія партыйныя арганізацыі не праяўляюць клопатаў аб сістэматычным паляпшэнні саставу партыі, дапускаюць парушэнні Статута ВКП(б), не захоўваюць прынцыпа індывідуальнага адбору ў партыю, прадаставіўшы, па сутнасці, справу прыёму ў партыю самацёку»[6].

Пастановы ЦК ВКП(б) і грунтоўны аналіз работы партарганізацый, праведзены партыйнымі органамі рэспублікі, дазволілі намеціць канкрэтныя меры па далейшаму ўдасканаленню росту папаўнення і сацыяльнага саставу прымаемых. У выніку праведзенай работы адбывалася хуткае аднаўленне колькасці камуністаў рэспублікі. На 1 сакавіка 1948 года ў КП(б)Б налічвалася 105 499 членаў і кандыдатаў партыі, у параўнанні з даваенным перыядам яна павялічылася на 40 % [7].

Партыйныя органы палепшылі сацыяльны састаў прымаемых, павялічылі прыём перадавікоў прамысловасці, сельскай гаспадаркі, інжынерна-тэхнічных работнікаў, аграномаў, настаўнікаў і іншых спецыялістаў народнай гаспадаркі. Напрыклад, калі ў саставе прынятых у члены партыі ў 1948 годзе рабочых і калгаснікаў было 18,8 %, то ў 1950 годзе ўжо 42,4 %, а колькасць інжынерна-тэхнічных работнікаў, аграномаў, урачоў, настаўнікаў і іншых спецыялістаў народнай гаспадаркі, прынятых кандыдатамі ў члены партыі, павялічылася з 15,1 у 1945 да 25,2 % у 1950 годзе [8].

Многія партыйныя камітэты нярэдка фарсіравалі рост радоў ва ўрон якасці, дапускалі самацёк у справе прыёму, не надавалі належнай увагі палітычнай падрыхтоўцы камуністаў. Таму XIX з'езд КПСС (кастрычнік 1952 года) абавязаў партыйныя органы кардынальна палепшыць работу з кандыдатамі. Унесеныя ў Статут ВКП(б) змяненні патрабавалі ад партыйных арганізацый па заканчэнні кандыдацкага стажу вырашаць пытан-

не аб яго падаўжэнні ці адмаўляць кандыдату, калі па асабістых якасцях ён не можа быць прыняты ў члены КПСС.

Выконваючы рашэнні з'езда, партыйныя арганізацыі павялічылі прыём рабочых і калгаснікаў, асоб, якія непасрэдна заняты ў сферы матэрыяльнай вытворчасці. У выніку гэтага на прадпрыемствах прамысловасці, транспарту, будаўніцтва, сувязі сярод прынятых у партыю ўзрасла ўдзельная вага рабочых, а ў калгасах — трактарыстаў, камбайнераў, аграномаў, заатэхнікаў і іншых работнікаў сельскай гаспадаркі. Так, калі ў 1950 годзе ў прамысловасці і будаўніцтве працавала 19,5, на транспарце і ў сувязі — 9,3, у сельскай гаспадарцы — 17,4, у гандлі, грамадскім харчаванні і іншых галінах матэрыяльнай вытворчасці — 10,6 % камуністаў, то ў 1955 годзе адпаведна — 19,4; 10; 25,9; 6,7 %[9]. Прыкметных поспехаў у гэтых адносінах дабіліся партыйныя арганізацыі Мінскай, Гомельскай, Магілёўскай абласцей.

XX і XXII з'езды КПСС, якія адыгралі важную ролю ў выкрыцці культа асобы І. В. Сталіна, аднаўленні ленінскіх норм партыйнага жыцця, дэмакратызацыі ўсіх бакоў жыцця савецкага грамадства, патрабавалі ад партыйных камітэтаў і арганізацый далейшага павышэння ўзроўню арганізацыйнай работы, узмацнення клопатаў аб індывідуальным адборы ў партыю перадавых людзей, перш за ўсё з ліку рабочых і калгаснікаў. Кіруючыся рашэннямі з'ездаў КПСС, а таксама XXII — XXV з'ездаў КПБ, партыйныя арганізацыі рэспублікі павысілі патрабаванні да ўступаючых, сталі больш строга вывучаць іх дзелавыя, палітычныя і маральныя якасці. У сувязі з дэмакратызацыяй жыцця савецкага грамадства, павелічэннем удзельнай вагі рабочых і калгаснікаў у саставе самадзейнага насельніцтва, павышэннем іх агульнаадукацыйнага і культурна-тэхнічнага ўзроўню, сацыяльнай і палітычнай актыўнасці намнога ўзрос паток заяў аб прыёме ў партыю, узмацнілася імкненне працоўных звязаць свой лёс з авангардам савецкага народа, таму партыйнае папаўненне ў другой палавіне пяцідзесятых гадоў было самым высокім за пасляваенныя гады. Дастаткова сказаць, што ў 1956 — 1961 гадах у рэспубліцы было прынята ў члены і кандыдаты КПСС амаль у 1,3 раза больш, чым у 1945 — 1955 гадах. Сярод прынятых у партыю стала больш рабочых і калгаснікаў. Так, на 1 студзеня 1945 года ўдзельная вага рабочых у Кампартыі Беларусі складала 24,6 %, сялян (калгаснікаў) — 10,1 %, а на 1 студзеня 1962 года адпаведна — 31,4, 23,9 %[10].

Пераважны прыём у партыю рабочых і калгаснікаў пацягнуў за сабой істотныя змяненні ў расстаноўцы камуністаў. Зменшылася колькасць іх у кіраўніцкім апараце. Напрыклад, колькасць камуністаў, занятых на адміністрацыйна-кіраўніцкіх і іншых пасадах у калгасах, скарацілася ў рэспубліцы з 30,7 на 1 студзеня 1959 года да 17 % на 1 студзеня 1962 года [11].

Партыйныя органы сталі больш увагі надаваць росту радоў за кошт перадавой часткі інтэлігенцыі, удзельная вага якой у саставе насельніцтва таксама пастаянна ўзрастала. Асабліва прыкметным станавіўся прыток у партыю інжынерна-тэхнічных работнікаў і іншых спецыялістаў народнай гаспадаркі. Так, у 1961 годзе было прынята ў партыю інжынерна-тэхнічных работнікаў, аграномаў, урачоў, настаўнікаў, эканамістаў і іншых спецыялістаў народнай гаспадаркі ў два з лішнім разы больш, чым у 1958 годзе, а іх удзельная вага ў ліку прынятых служачых узрасла з 57,1 % у 1958 да 68,4 % у 1961 годзе. З 1956 па 1962 год з агульнай колькасці служачых, прынятых кандыдатамі ў члены КПСС, колькасць інжынерна-тэхнічных работнікаў павялічылася з 28 да 41,8 %[12].

Партыйныя арганізацыі надавалі важнае значэнне паляпшэнню свайго саставу за кошт моладзі, перш за ўсё камсамольцаў, а таксама жанчын. Рост колькасці і ўдзельнай вагі гэтых катэгорый насельніцтва, актыўны ўдзел іх у палітычным, гаспадарчым і культурным жыцці рэспублікі не маглі не адбіцца на саставе КПБ. Сярод прынятых у партыю яны складалі значную частку. Калі ў 1945 годзе з агульнай колькасці прынятых у кандыдаты партыі ў Беларусі членаў ВЛКСМ налічвалася 38,4 %, то ў 1961 годзе — 44,3. З 1945 па 1962 год у КПБ колькасць жанчын павялічылася з 5119 да 42 804 чалавек, гэта значыць больш чым у восем разоў, а іх удзельная вага на 1 студзеня 1962 года склала 17,1 %[13].

Рост культурнага і адукацыйнага ўзроўню працоўных суправаджаўся павелічэннем удзельнай вагі камуністаў з вышэйшай і сярэдняй адукацы-

яй. Калі на 1 студзеня 1945 года ў КПБ налічвалася камуністаў з вышэйшай, незакончанай вышэйшай і сярэдняй адукацыяй 41,5, з пачатковай — 28,8, не меўшых пачатковай адукацыі — 3,4 %, то на 1 студзеня 1962 года іх ужо было адпаведна — 42,9; 26,9 і 0,9 % [14].

Адной з важнейшых умоў паляпшэння якаснага саставу партыі з'яўляецца захаванне марксісцка-ленінскага прынцыпу інтэрнацыяналізма пры фарміраванні яе радоў. Ажыццяўленне гэтага прынцыпу дае магчымасць партыі паспяхова выконваць ролю правадыра, забяспечваць кіраўніцтва ўсімі бакамі жыцця і дзейнасці савецкага грамадства. Хуткае аднаўленне народнай гаспадаркі, размах сацыялістычнага будаўніцтва ў краіне пацягнулі за сабой шырокую інтэрнацыяналізацыю насельніцтва, што адбілася на саставе партыі. Толькі з 1956 па 1962 год колькасць рускіх у КПБ павялічылася ў 1,4, беларусаў — у 1,9, украінцаў — у 1,6, яўрэяў — у 1,2, прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей — у 2 разы. У той жа час тэмпы прыросту колькасці камуністаў-беларусаў перавышалі тэмпы росту партыйнай арганізацыі рэспублікі. Калі агульная колькасць камуністаў рэспублікі з 1945 па 1962 год узрасла ў 8,4, то камуністаў карэннай нацыянальнасці — у 12,2 раза [15].

Такім чынам, у даследуемыя гады Кампартыя Беларусі значна павялічылася колькасна і палепшылася якасна. Многія партыйныя арганізацыі былі ўмацаваны перадавікамі прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Вядучае становішча ў КПБ занялі лепшыя прадстаўнікі рабочага класа, калгаснага сялянства, інтэлігенцыі. У саставе служачых намнога ўзрасла колькасць інжынерна-тэхнічных работнікаў, спецыялістаў сельскай гаспадаркі, камсамольцаў, жанчын, прадстаўнікоў карэннай нацыянальнасці. Павысіўся агульнаадукацыйны і прафесіянальны ўзровень камуністаў. Усё гэта павышала ўплыў партыйных арганізацый на жыццё і дзейнасць працоўных калектываў, усіх працоўных рэспублікі.

Ажыццяўляючы рашэнні XXVII з'езда КПСС, Кампартыя Беларусі, абапіраючыся на вопыт камуністаў папярэдніх пакаленняў, і цяпер праводзіць настойлівую і мэтанакіраваную работу па далейшаму ўдасканаленню росту партыйных радоў, паляпшэнню іх якасці і павышэнню авангарднай ролі камуністаў. «Убіраючы ў сябе перадавых прадстаўнікоў рабочага класа, калгаснага сялянства, савецкай інтэлігенцыі, — адзначаецца ў новай рэдакцыі Праграмы КПСС, — партыя ўзмацняе свой уплыў на розныя ўчасткі камуністычнага будаўніцтва. КПСС лічыць неабходным, каб у яе сацыяльным саставе вядучае месца займалі рабочыя. Вызначальнымі ўмовамі прыёму ў рады партыі былі і застаюцца палітычныя і дзелавыя якасці чалавека, сумленнасць і прыстойнасць, гатоўнасць аддаць свае сілы справе камунізма»[16].

[1] Ленін У. І. Творы. Т. 30. С. 44.
[2] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 20, спр. 229, л. 5, 6; воп. 47, спр. 135, л. 161.
[3] Большэвік Беларусі. 1946, № 9. С. 41.
[4] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 93, спр. 30, л. 2.
[5] КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. М., 1985. Т. 8. С. 24, 80.
[6] Там жа. С. 25.
[7] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 20, спр. 247, л. 34.
[8] Гл.: Патоличев Н. С. Отчетный доклад Центрального Комитета Коммунистической партии (большевиков) Белоруссии на XX съезде КП(б)Б 20—23 сентября 1952 г. Минск, 1952. С. 66; Коммунистическая партия Белоруссии в цифрах (1918—1978). Минск, 1978. С. 59.
[9] Там жа. С. 131, 132.
[10] Там жа. С. 50, 51; 76, 77 (падсумавана аўтарам).
[11] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 93, спр. 252, л. 20.
[12] Там жа. Л. 9; Коммунистическая партия Белоруссии в цифрах. С. 60.
[13] Там жа. С. 64, 65, 154, 155.
[14] Там жа. С. 87, 88.
[15] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 93, спр. 221, л. 3; спр. 252, л. 2; Коммунистическая партия Белоруссии в цифрах. С. 102 (падсумавана аўтарам).
[16] Материалы XXVII съезда Коммунистической партии Советского Союза. М., 1986. С. 185.